УДК 94(476-15)"1939"

*М. А. Бяспалая*

# Восень 1939 г.: кардынальныя змены сацыякультурнага жыцця Заходняй Беларусі

*У артыкуле разглядаюцца падзеі, якія адбываліся на тэрыторыі Заходняй Беларусі ў верасні–лістападзе 1939 г. Раскрываюцца адметныя рысы сацыяльна-палітычнай сітуацыі, якая сфарміравалася ва «ўсходніх крэсах» на працягу 1921–1939 гг. і стала адной з умоў хуткага ўсталявання савецкай улады. Прааналізаваны метады рэалізацыі эканамічнай і сацыякультурнай палітыкі, таксама адносіны да іх мясцовага насельніцтва.*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Падзеі восені 1939 г. у Заходняй Беларусі і іх наступствы да цяперашняга часу выклікаюць неадназначныя ацэнкі. У савецкай навуковай і грамадскай думцы трывала замацавалася ўяўленне аб іх як аб вялікім «вызваленчым паходзе» Чырвонай арміі. Аб гэтым сведчаць даследаванні такіх аўтарытэтных вучоных, як У. Ф. Ладысеў і У. А. Палуян. У першыя постсавецкія гады стала актуальным крытычнае стаўленне да падзей, якія адбываліся восенню 1939 г.

Навукоўцы суверэннай Беларусі пачалі больш аб'ектыўна і аргументавана даследаваць як палітычную, так і сацыяльна-культурную сітуацыю ў Заходняй Беларусі, якая вельмі хутка змянялася на працягу верасня 1939 г. – чэрвеня 1941 г. У ліку першых па гэтай праблеме абаранілі дысертацыі Л. М. Рагачова [4] і А. В. Пашкевіч [3]. Значнай падзеяй у навуковым і грамадска-палітычным жыцці краіны стала выданне зборніка дакументаў «Ты з Заходняй, я з Усходняй нашай Беларусі…» [5]. Адзначым крыніцазнаўчую важнасць дакументаў па разглядаемай тэме, змешчаных у гісторыка-дакументальных хроніках «Памяць» заходніх раёнаў Рэспублікі Беларусь. Аднак іх аналіз патрабуе значнай аналітычнай працы і можа стаць прадметам асобнага даследавання, мы абмежаваліся толькі хронікай малой радзімы – Пінскага раёна [2].

У папярэднім артыкуле[1] згадвалася аб гарантыі польскімі ўладамі нацыянальных праў беларускаму насельніцтву, што станоўча было ўспрынята дзеячамі нацыянальнага руху. Перад імі стаяла задача выпрацаваць праграму, якая б адпавядала інтарэсам беларусаў. Першыя крокі ў гэтым кірунку аказаліся няўдалымі. У студзені 1922 г. у Віленскім краі адбыліся выбары ў мясцовы сейм. Іх вынікі павінны былі зафіксаваць прыналежнасць краю да Літвы ці Польшчы. Мясцовыя беларускія лідары абралі не зусім прадуманы варыянт дзеянняў і аб'явілі байкот выбарам. Яны разлічвалі на падтрымку гэтай пазіцыі прадстаўнікамі

[1] Бяспалая М. А. Заходняя Беларусь («Усходнія Крэсы»): два дзесяцігоддзі выпрабаванняў // Веснік БДУКМ. – 2019. – № 3(33). – С. 11–21.

іншых нацыянальнасцей, каб у выніку выбары, арганізаваныя польскай уладай, праваліліся і заходнія дзяржавы перадалі Віленскі край Літве. Аднак усё атрымалася наадварот, абраны сейм прагаласаваў за перадачу краю Польшчы. Такім чынам, надзеі на захаванне Віленскага краю як асяродка, спрыяльнага для развіцця беларускага нацыянальнага руху, не спраўдзіліся. Таму беларускім дзеячам прыйшлося распрацоўваць новую стратэгію і тактыку.

Нельга было пакінуць па-за ўвагай, на наш погляд, вельмі значны факт: падзел тэрыторыі Беларусі і выкліканая ім «культурная траўма» ўскалыхнулі нацыянальнае пачуццё. Прычым усведамленне нацыянальнай еднасці ахапіла самыя розныя колы беларускага грамадства па абодва бакі новаўтворанай мяжы. Дарэчы, як ні парадаксальна, але трагедыя падзелу садзейнічала працэсу хуткай нацыянальнай самаідэнтыфікацыі мясцовага насельніцтва, абуджэнню гістарычнай і культурнай памяці, пачуцця нацыянальнай годнасці і адзінства.

Сітуацыя 1920–1930-х гг., безумоўна, адрознівалася ад папярэдніх падзелаў, якія перажыла Беларусь у другой палове XVIII ст., знаходзячыся ў складзе Рэчы Паспалітай. На працягу двух дзесяцігоддзяў у жыццёвым укладзе большасці мясцовага насельніцтва мала што змянілася. Галоўнымі цэнтрамі эканамічнага і сацыякультурнага жыцця заставаліся маёнтак і царква, шырокае нацыянальнае абуджэнне мясцовага насельніцтва не праяўлялася. Зусім іншая сітуацыя склалася ў разглядаемы перыяд. На яе фарміраванне аказвалі самыя разнастайныя фактары: ад палітычных – наяўнасць беларускіх арганізацый і партый розных кірункаў, да сацыякультурных – уздзеянне сродкаў масавай камунікацыі, мастацтва, культурнай палітыкі і інш.

Галоўным фактарам выступаў прыклад Савецкай Беларусі. На пазіцыю дзеячаў беларускага руху ў Заходняй Беларусі прыкметны ўплыў аказаў працэс беларусізацыі, які разгарнуўся ў БССР, падзеі ў Савецкай Беларусі ўспрымаліся як пуцяводная зорка, да якой трэба імкнуцца ўсімі сіламі. Савецкая прапаганда са свайго боку імкнулася стварыць з удзельнікаў антыпольскага змагання вобраз непахісных барацьбітоў, якія ахвяруюць жыццём у імя светлага будучага народа ў адзінай дзяржаве. Быў нават выпрацаваны своеасаблівы рытуал: на пасяджэннях самых разнастайных узроўняў, калі давалі слова барацьбітам з Заходняй Беларусі, дзеля канспірацыі ў зале выключалі святло і ў цемнаце гучаў голас, які расказваў аб крыўдзе і пакутах народа, яго змаганні. Такая атмасфера, безумоўна, не магла не ўздзейнічаць на прысутных.

У асяроддзі нацыянальна арыентаваных колаў існавалі розныя падыходы да рэальнай сітуацыі. Адны не хацелі прызнаваць уладу Польшчы над Заходняй Беларуссю і заклікалі да ўзброенай барацьбы, іншыя выступалі за легальную парламенцкую дзейнасць. Да першай плыні

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

адносіліся дзеячы Камуністычнай партыі Заходняй Беларусі (КПЗБ), якая арганізацыйна аформілася як частка кампартыі Польшчы ў 1923 г. і спачатку налічвала 528 чалавек, а ў 1934 г. – 4 тыс. КПЗБ выдавала на беларускай мове газету «Чырвоны сцяг» і часопіс «Бальшавік», выступала за самавызначэнне Заходняй Беларусі і аб'яднанне з БССР. У 1924 г. быў створаны Камуністычны саюз моладзі Заходняй Беларусі (ЛКСМЗБ). Пад кіраўніцтвам гэтых арганізацый партызанскімі метадамі дзейнічалі падпольныя паўстанцкія групы агульнай колькасцю 5–6 тыс. чалавек. На чале іх знаходзіліся прадстаўнікі КП(б)Б В. З. Корж, К. П. Арлоўскі, А. М. Рабцэвіч і інш. Барацьба з польскімі ўладамі заключалася ў разгроме паліцэйскіх участкаў, нападзенні на сядзібы памешчыкаў, чыноўнікаў, асаднікаў.

Другую плынь нацыянальнага руху ўтваралі прыхільнікі парламенцкіх форм барацьбы. Праведзеная імі актыўная работа падчас выбарчай кампаніі ў парламент (сейм і сенат) Польшчы ў студзені–ліпені 1922 г. мела пэўныя поспехі. У Цэнтральны выбарчы камітэт у Заходняй Беларусі ўвайшлі прадстаўнікі ўсіх беларускіх партый. Такога адзінства, як на выбарах 1922 г., беларускія партыі больш ніколі не дасягалі. У выніку ў парламент Польшчы ўвайшло 11 беларускіх паслоў і 3 сенатары. Яны ўтварылі *Беларускі пасольскі клуб* (БПК).

У сейме і сенаце беларускія дэпутаты часта выступалі, падавалі запыты па розных пытаннях, якія датычыліся становішча беларусаў, уваходзілі ў сенацкія і сеймавыя камісіі, падымалі беларускае пытанне і на міжнародным узроўні. Спачатку ў беларускіх дэпутатаў была надзея на паразуменне з польскімі левымі партыямі і ўладай. Але разлікі аказаліся памылковымі. БПК пачаў хутка радыкалізавацца і ў маі 1923 г. перайшоў у апазіцыю да ўлады. Пад уплывам камуністаў у чэрвені 1925 г. адбыўся раскол Беларускага пасольскага клуба, у выніку з яго вылучылася *Беларуская сялянска-работніцкая грамада* (БСРГ). Галоўнай прычынай гэтага падзелу пераважная большасць гісторыкаў называе пераход да тактыкі падтрымкі не нацыянальных, а класавых інтарэсаў, у прыватнасці падпарадкаванне дырэктывам Камуністычнага інтэрнацыянала (Камінтэрна). БСРГ прыняла гэты кірунак, а БПК не падтрымаў такую арыентацыю.

У 1925–1927 гг. найбольш вядомай сярод насельніцтва Заходняй Беларусі была Беларуская сялянска-работніцкая грамада. Арганізатарамі БСРГ былі Б. Тарашкевіч, С. Рак-Міхайлоўскі, П. Мётла і інш. Мэта грамадаўцаў – утварэнне рэвалюцыйнага рабоча-сялянскага ўрада, саюз з народамі, якія будуюць новы лад, ліквідацыя асадніцтва, надзяленне сялян зямлёй. Папулярнасць заклікаў і праграмы БСРГ была значнай. На 1927 г. дзейнічала больш за 2 тыс. гурткоў, якія аб'ядноўвалі каля 120 тыс. членаў гэтай арганізацыі, выходзілі газеты «Жыццё беларуса» і «Наш голас». Але шырока разгарнуць дзейнасць БСРГ фактычна не па-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

спела, таму што ў маі 1926 г. у Польшчы адбыўся пераварот, арганізаваны Ю. Пілсудскім, і краіна ўступіла ў перыяд «санацыі» (ачышчэння). Парламенцкая дзейнасць і недатыкальнасць гублялі значнасць, усе праблемы вырашаліся на ўзроўні выканаўчай улады. У пачатку студзеня 1927 г. былі арыштаваны паслы ад грамады, а ў ноч на 15 студзеня арыштавана 490 найбольш актыўных яе дзеячаў, а 21 сакавіка 1927 г. БСРГ была забаронена.

З канца 1920-х гг. дзейнасць заходнебеларускай парламенцкай апазіцыі паступова пачала затухаць. Нягледзячы на мінімальныя адрозненні ў партыйных праграмах, заходнебеларускі нацыянальны рух не меў адзінства. Ён быў падзелены на чатыры лагеры, а яго дзеячы прытрымліваліся ўласных пазіцый, таму не маглі аб'яднацца, каб супрацьстаяць моцнаму польскаму ўплыву. У выніку выбараў 1928 г. у парламент прайшлі 10 паслоў і два сенатары ад беларускіх партый, але яны адразу падзяліліся на дзве фракцыі: Беларускі пасольскі клуб і Беларускі пасольскі клуб «*Змаганне за інтарэсы сялян і работнікаў*», якія ўпарта змагаліся паміж сабой. Апошні раз беларускія нацыянальныя арганізацыі прымалі ўдзел у выбарах у 1930 г. [3, с. 13].

Такім чынам, дзеячы беларускага нацыянальнага руху не змаглі распрацаваць адзіную праграму і эфектыўную тактыку змагання за інтарэсы насельніцтва Заходняй Беларусі. Аднак ідэя ўз'яднання з БССР аказалася вельмі актуальнай, за яе дасягненне рознымі сродкамі змагаліся тысячы сялян і рабочых. У большасці выпадкаў ужывалася тактыка пасіўнага супраціўлення распараджэнням польскіх улад, ажыццяўлялася падпольная антыпольская агітацыя. Падобныя дзеянні жорстка караліся ўладай, якая не спынілася нават перад стварэннем аднаго з першых у Еўропе канцлагераў у Бярозе-Картузскай, які стаў сімвалам рэпрэсіўнай палітыкі польскага рэжыму. Праз яго прайшлі тысячы змагароў за адзінства беларускага народа. Некаторыя згубілі тут жыццё, а другія зведалі фізічныя і маральныя здзекі, памяць аб якіх пранеслі праз жыццё. І тут можна паставіць рытарычнае пытанне: чаму нацыя, якая ў сваёй гісторыі перажыла не толькі падзелы тэрыторыі, але і моцны нацыянальны ціск, не давала магчымасці насельніцтву «ўсходніх крэсаў» карыстацца хаця б культурнай аўтаноміяй? Каб не абвінавачваць улады ў праяўленні вялікапольскага шавінізму, звернемся да ўяўленняў аб велічы Рэчы Паспалітай у пачатку XIX ст. і прадвызначэнні польскай нацыі, што культываваліся ў польскім грамадстве і ярка праявіліся ў творчасці Адама Міцкевіча. Галоўная ідэя: нацыя змагла выжыць у неспрыяльных умовах і адрадзіцца. Польшчы і яе народу як носьбітам свабоды наканавана апекаваць іншыя народы РП. Аднак для дасягнення гэтай мэты абраныя сродкі не адпавядалі такому ідэалізаванаму высокаму прадвызначэнню.

У дадатак да праблем, што існавалі, уваходжанне Чырвонай арміі на тэрыторыю Заходняй Беларусі суправаджалася складанымі

РЭПАЗІТОРЫЙ БДУКІ

міжнароднымі абставінамі і дыпламатычнымі адносінамі. Ішла Другая сусветная вайна, у якую была ўцягнута і Заходняя Беларусь. Спашлёмся на ўспаміны сучасніцы тых падзей В. Храптовіч-Буцянёвай, жонкі ўладальніка Шчорсаў: «Сярод жыхароў нарастала трывога і страх перад невядомасцю і здавалася непазбежнасцю катастрофы. <…> Бесперапынныя заклікі па радыё да аб'яднання, да захавання спакою, да ўсеагульнай мабілізацыі трымалі ў пастаянным напружанні. Дарогі былі забіты польскімі войскамі і бежанцамі» [7, с. 5].

17 верасня сітуацыя кардынальна змянілася. У Шчорсы патэлефанавалі з Нясвіжа, ад Радзівілаў, і перадалі: «“Саветы перайшлі граніцу…”, а з Навагрудка паведамлялі, што ў горадзе пачалася паніка. Прыход бальшавікоў застаў усіх знянацку: той, хто яшчэ мог, уцякаў на захад…» [Там жа, с. 7]. Стала вядома, што на гэты час польскі ўрад пакінуў краіну, польская армія фактычна пацярпела паражэнне і амаль уся тэрыторыя Польшчы была акупіравана немцамі. Да 1 кастрычніка 1939 г. Чырвоная армія заняла этнічную тэрыторыю Заходняй Беларусі і падышла да мяжы, вызначанай пагадненнямі з Германіяй 23 жніўня 1939 г. Большасць мясцовага насельніцтва сустракала Чырвоную армію як сілу, здольную вызваліць іх ад эканамічнага, палітычнага, нацыянальнага прыгнёту. Гэта быў эмацыянальны парыў. Людзі, ад якіх нас аддзяляе не адно пакаленне, былі іншыя, чым мы, яны жылі ў рэальнай цяжкай і неўспрымальнай многімі сітуацыі і жадалі яе змены на абяцаную светлую будучыню.

Дакументальныя матэрыялы і дадзеныя вуснай гісторыі сведчаць, што калі Чырвоная армія перайшла мяжу і стала імкліва набліжацца да Пінска, удзельнікі антыпольскага падполля стварылі паўстанцкі штаб. Атрад паўстанцаў захапіў мост на падыходах да горада, а атрад сялян заняў дзве чыгуначныя станцыі на магістралі Брэст-Гомель, устанавіў кантроль над участкам шашы Пінск-Брэст і ўтрымліваў іх да 20 верасня, да прыходу Чырвонай арміі. Па вёсках усхваляванае насельніцтва ладзіла ўрачыстыя сустрэчы: будавалі аркі, упрыгожаныя кветкамі, сустракалі чырвонаармейцаў хлебам і соллю. А потым адбываліся спантанныя, бурлівыя, узрушаныя мітынгі, на якіх выступалі палітработнікі з прамовамі, сяляне з паведамленнямі аб сваіх праблемах [2, с. 218]. Як успаміналі ўдзельнікі мітынгаў, пытанні былі розныя, нават такога кшталту, ці ёсць у савецкай улады газа, бо ў вёсцы перабоі з яе дастаўкай. На гэта прагучаў адказ: «У савецкай улады газы столькі, што ў ёй можна ўтапіць усю сусветную буржуазію». Аб «ваяўнічых» настроях сярод вяскоўцаў сведчыць расказаны відавочцамі факт: адзін з заможных сялян на мітынгу трымаў партрэт Л. Берыі, да яго падышоў селянін з бедных і адабраў партрэт са словамі: «Ты не варты трымаць партрэт правадыра сусветнага пралетарыяту таварыша Берыі».

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

22 кастрычніка 1939 г. пры надзвычайнай актыўнасці насельніцтва адбыліся выбары ў Народны сход Заходняй Беларусі, які 28 кастрычніка пачаў работу ў Беластоку. Па традыцыі адкрыў Народны сход старэйшы сялянскі дэпутат С. Ф. Струг з в. Маісеявічы Ваўкавыскага павета. Сярод 926 дэпутатаў быў 621 беларус, 127 палякаў і г. д. [5, с. 44–47]. Парадак дня Народнага сходу ўключаў пытанні аб дзяржаўнай уладзе, уваходжанні Заходняй Беларусі ў склад БССР, аграрных пераўтварэннях, нацыяналізацыі банкаў, буйной прамысловасці. 2 лістапада 1939 г. паўнамоцная камісія Народнага сходу Заходняй Беларусі ў складзе 66 чалавек перадала Вярхоўнаму Савету СССР сваё рашэнне аб уваходзе ў склад СССР. Сесія Вярхоўнага Савета вырашыла ўключыць Заходнюю Беларусь у склад СССР і ўз'яднаць яе з Беларускай ССР. 14 лістапада 1939 г. нечарговая сесія Вярхоўнага Савета БССР прыняла закон *«Аб прыняцці Заходняй Беларусі ў склад Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі»*. Такім чынам, здзейсніўся акт гістарычнай справядлівасці, у выніку якога беларускі народ быў аб'яднаны ў адной дзяржаве [Там жа, с. 52–53].

На тэрыторыі Заходняй Беларусі было створана пяць абласцей – Баранавіцкая, Беластоцкая, Брэсцкая, Вілейская, Пінская. Насельніцтву аказвала дапамогу ўся краіна: паставілі 14 811 т солі, 2755 т цукру, 3216 т газы, на многія тысячы рублёў мыла, махоркі, 20 тыс. скрыняў запалак і інш. [1]. Не толькі з БССР, але і з іншых рэспублік у Заходнюю Беларусь накіроўваліся партыйныя і савецкія работнікі, многія пасады займалі былыя ўдзельнікі антыпольскага падполля. Яны заняліся наладжваннем працы існуючых і адкрыццём новых прадпрыемстваў, медыцынскага абслугоўвання насельніцтва, зменамі ў сельскай гаспадарцы і інш.

У заходніх абласцях БССР да вясны 1940 г. былі створаны органы мясцовай улады – *Саветы дэпутатаў працоўных*. Разам з партыйнымі арганізацыямі яны ажыццяўлялі нацыяналізацыю прамысловасці і гандлю, аб'ядноўвалі рамеснікаў і саматужнікаў у прамысловыя арцелі. Аднаўляліся і будаваліся прамысловыя прадпрыемствы. У канцы 1940 г. дзейнічалі 392 фабрыкі і заводы, на якіх працавалі амаль 40 тыс. рабочых. Распрацоўваліся грандыёзныя планы, напрыклад, асушэння на працягу 15 гадоў да чатырох мільёнаў гектараў забалочаных зямель, аб масавай пасадцы пладовых дрэў вакол сядзіб, падрыхтоўцы адпаведных спецыялістаў і г. д.

Безумоўна, галоўным для кожнай сям'і было зямельнае пытанне. Беззямельным і малазямельным сялянам пры ўдзеле створаных *сялянскіх камітэтаў* было раздадзена да аднаго мільёна гектараў зямлі, канфіскаванай у памешчыкаў. Да прыкладу, сяляне Піншчыны атрымалі ў сваё карыстанне больш за 15 тыс. га зямлі, 6 тыс. га сенажаці, каля

4 тыс. кароў, 800 коней і г. д. На курсах трактарыстаў вучылася 150 чалавек, з іх 26 дзяўчат, на курсах камбайнераў – 100 чалавек. Да вясны 1940 г. у Пінскай вобласці было арганізавана 11 МТС і завезена 52 трактары [2, с. 224]. Трэба прызнаць, што большасць сялян падтрымлівала канфіскацыю зямлі ў памешчыкаў, ануляцыю ўсіх запазычанасцей польскай дзяржаве, дэпартацыю ў 1940 г. асаднікаў, леснікоў, памешчыкаў. Маёмасць, якая засталася пасля высялення, планавалася раздаць будучым калгасам і саўгасам. Аднак значную яе частку паспела разабраць навакольнае насельніцтва.

З вясны 1940 г. арганізоўваліся калектыўныя гаспадаркі, у некаторых месцах па ініцыятыве саміх сялян. У хуткім часе было створана 430 калгасаў. Савецкая ўлада мела дзесяцігадовы вопыт калгаснага будаўніцтва, таму стварэнне калектыўных гаспадарак у Заходняй Беларусі адбывалася па пракладзенай дарожцы. Удзельнічалі ў гэтым працэсе і дзяржаўныя ўстановы, якія валодалі напрацаванымі за савецкі час метадамі і формамі палітычнага і культурнага асветніцтва, наладжанай структурай адпаведных органаў. Быў адзначаны выразны патрыятычны ўздым сярод вяскоўцаў. Людзі працавалі не шкадуючы сябе, каб наблізіцца да таго ідэалу, аб якім яны шмат чулі ад дасведчаных аднавяскоўцаў. Своеасаблівым паказчыкам расчаравання ў калектыўным гаспадаранні стала прымусовае аднаўленне калгасаў у 1949 г.

Важнае дасягненне савецкай улады – наладжванне сістэмы адукацыі. У Заходняй Беларусі школьная сетка дасягнула амаль 6 тыс. школ, у тым ліку 120 сярэдніх, значная колькасць іх працавала на беларускай мове. У школу пайшлі дзеці, якія раней не мелі магчымасці вучыцца. Было ўведзена ўсеагульнае пачатковае навучанне. На тэрыторыі пяці заходніх абласцей пачалі працаваць чатыры настаўніцкія інстытуты і 25 спецыяльных сярэдніх навучальных устаноў, мед- і педвучылішчаў, тэхнікумаў.

Савецкі вопыт культурнага і палітычнага асветніцтва быў механічна пашыраны на заходнія вобласці. У 1941 г. тут дзейнічала 220 бібліятэк, 92 дамы культуры, 100 кінатэатраў [4, с. 86, 91]. Палітычнае асветніцтва аўтаматычна паўтарала звыклую структуру: хаты-чытальні як нізавыя звёны, народныя дамы ў буйных пасёлках і дамы культуры ў гарадах. Кірункі, формы і метады іх работы дастаткова прадказальныя, абавязковым з'яўлялася забеспячэнне шырокай падтрымкі дзяржаўнай палітыкі. Аднак паўставала праблема падрыхтоўкі кадраў. Галоўным сродкам першаснага азнаямлення з прафесіяй з'яўляліся курсы па падрыхтоўцы бібліятэкараў, хатнікаў, клубных работнікаў, на якіх летам 1940 г. навучаліся каля 400 чалавек [4, с. 99].

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Іншая справа – культурнае асветніцтва, асабліва падтрымка масавай ініцыятывы па арганізацыі самадзейнай мастацкай творчасці з мэтай паляпшэння палітычнага, культурнага і мастацкага выхавання насельніцтва. Пад кіраўніцтвам Упраўлення па справах мастацтва пры СНК БССР пры абласных аддзелах мастацтваў ствараліся дамы народнай творчасці (ДНТ). Метады працы ДНТ былі ідэнтычнымі папярэдняму савецкаму перыяду: інструктыўныя нарады, творчыя нарады, нарады-кансультацыі на месцах, рассылка метадычных пісем па пытаннях арганізацыі гурткоў, падрыхтоўка да выбараў, творчых алімпіяд, 8 Сакавіка, 1 Мая, чарговай гадавіны Кастрычніка, Сталінскай канстытуцыі (5 снежня 1936 г.) і г. д.

На працягу года актыўна ствараліся аматарскія гурткі: харавыя, драматычныя, аркестравыя, танцавальныя. Самадзейныя артысты абслугоўвалі ў час выбараў участкі: рыхтавалі спецыяльныя праграмы, арганізоўвалі мясцовых умельцаў, каб упрыгожыць участкі, выступалі з канцэртамі, нават па некалькі разоў у дзень, праводзілі конкурсы, алімпіяды. Лепшыя нумары траплялі на рэспубліканскі агляд мастацкай самадзейнасці заходніх абласцей, а пасля чарговага адборачнага конкурсу – на Дэкаду беларускага мастацтва ў Маскву. На выстаўку дасягненняў народнай гаспадаркі і дэкаду адбіраліся прадметы народнай творчасці, работы скульптараў, мастакоў (напрыклад, з Пінскай вобласці на дэкаду трапілі 17 карцін самадзейных майстроў, у ліку якіх «Ленін і Сталін – арганізатары беларускай дзяржаўнасці»).

Адначасова з узнікненнем самадзейных гурткоў у галіне музычнага і харавога мастацтва ствараліся і тэатральныя гурткі. Аналагічна вышэйапісанай схеме адбываўся і працэс падрыхтоўкі да Усесаюзнага агляду тэатральнай самадзейнасці. У ліпені 1940 г. ДНТ разаслалі метадычныя пісьмы, ажыццявілі выезды на месцы, адабралі лепшых. Рэпертуар большасці гурткоў складалі п’есы на ваенную тэматыку. Арганізатары Усесаюзнага агляду ставілі на мэце ўзняць творчы ўзровень самадзейных калектываў у барацьбе за мастацтва сацыялістычнага рэалізму.

У галіне самадзейнай тэатральнай творчасці была падтрымана ініцыятыва народных артыстаў СССР В. В. Барсавай і І. М. Масквіна па шэфскай дапамозе майстроў прафесійнага мастацтва самадзейным артыстам. У 1940-я гг. у Маскве шэфскі рух набыў сапраўды шырокі размах. У БССР на нарадзе майстроў мастацтваў, прадстаўнікоў клубаў і кіраўнікоў тэатральных гурткоў было прынята рашэнне аб замацаванні артыстаў за падшэфнымі калектывамі, створаны савет па кіраўніцтве шэфствам.

Кіруючыя органы, як і два дзесяцігоддзі назад, вызначалі рэпертуар самадзейных тэатральных калектываў праз падбор і рассылку п’ес.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У гэты перыяд самадзейныя артысты сталі сведкамі незразумелай з'явы, калі пачалі прыходзіць загады Галоўнага ўпраўлення па кантролі за відовішчамі і рэпертуарам, у якіх рэкамендавалася зняць з пастаноўкі п'есы «Гібель эскадры» А. Карнейчука, «Карані капіталізму» М. Зошчанкі, таксама Б. Шоу, В. Катаева і інш. Нечаканасцю для ДНТ было пісьмо, у якім забаранялася выконваць такія песні, як, напрыклад, «Мы – камсамол», «Песня спартакаўцаў», «Песня чырвоных франтавікоў», «Пісьмо Варашылаву», «Бірабіджанская калыханка» і інш. Тое ж самае можна сказаць і аб рэпертуары музычных гурткоў, якім зноў жа праз ДНТ рассылаліся зборнікі ваенных песень, песень савецкіх кампазітараў [6, лл. 17, 19, 28].

Аўтар артыкула раней выказваў думку, што падзеі ў галіне палітычнага і культурнага асветніцтва ў заходніх раёнах БССР выразна адлюстроўвалі наступнае: па-першае, імклівае распаўсюджванне адпаведных структур у новым сацыякультурным асяроддзі; па-другое, у гэтым працэсе амаль не ўлічваліся сацыякультурныя асаблівасці рэгіёна; па-трэцяе, энтузіязм, выкліканы новым укладам жыцця, асабліва сярод моладзі, эфект навізны садзейнічалі безбалючаму ўкараненню ў сацыякультурнае жыццё Заходняй Беларусі напрацаваных за савецкі перыяд форм і метадаў розных відаў асветніцтва.

Аднак не ўсе крокі савецкай улады аказаліся бездакорнымі і гуманнымі. Для многіх жыхароў Заходняй Беларусі яны прынеслі шмат гора – непапулярныя сацыяльна-эканамічныя пераўтварэнні, канфіскацыя маёмасці, рэпрэсіўныя меры. Першыя арышты былі праведзены ўжо восенню 1939 г., а ў лютым, красавіку і чэрвені 1940 г. адбылася масавая дэпартацыя жыхароў Заходняй Беларусі, наступная хваля прайшла ў чэрвені 1941 г. Напрыклад, з Пінска эшалон з дэпартуемымі людзьмі адправіўся ў 4 гадзіны раніцы 22 чэрвеня 1941 г. Згодна з афіцыйнымі данымі, у заходніх абласцях БССР было рэпрэсіравана каля 150 тыс. чалавек.

Эмацыянальная хваля відавочнага поспеху, сацыяльна-класавая рыторыка прадстаўнікоў савецкай улады садзейнічалі праяўленню крайняга рэвалюцыйнага экстрэмізму, у выніку якога пацярпела шмат паважаных людзей. Яркі прыклад – лёс сям'і Скірмунтаў з маёнткаў Моладава і Парэчча, недалёка ад Пінска, члены якой загінулі ў сталым узросце ад рук некалькіх чалавек, чымсьці не задаволеных. Сярод загінуўшых быў і Раман Скірмунт, былы дэпутат Дзяржаўнай думы, сябра Дзяржаўнага савета, актыўны дзеяч Мінскага таварыства сельскіх гаспадароў, прадбачлівы і таленавіты прадпрымальнік, стваральнік алфавіта палеска-пінскага дыялекту і інш.

Рэпрэсіі закранулі і многіх былых удзельнікаў нацыянальна-вызваленчага руху ў Заходняй Беларусі: ад дзеячаў беларускіх дэмакратычных

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

арганізацый – БСРГ, БХД, БСС да Камуністычнай партыі і камсамола Заходняй Беларусі.

У якасці высновы адзначым надзвычай хуткую змену палітычнай і сацыякультурнай сітуацыі ў Заходняй Беларусі. Яна стала вынікам паходу Чырвонай арміі, які пачаўся 17 верасня і завяршыўся на працягу двух тыдняў. У гісторыі, мабыць, не знойдзецца такога выразнага прыкладу актыўнай падтрымкі насельніцтвам прыходу арміі іншай краіны. Аднак, на наш погляд, самае незвычайнае заключаецца ў маланкавай замене адной палітычнай, сацыяльнай, эканамічнай і культурнай сістэмы на супрацьлеглую. Адмаўляць наяўнасць антысавецкіх настрояў у заходнебеларускім грамадстве няма падстаў, аднак большасць насельніцтва падтрымала савецкую ўладу і паверыла ў яе. Менавіта самаадданая дзейнасць прасавецка настроеных жыхароў заходнебеларускіх вёсак і гарадоў, іх разуменне сітуацыі, патрыятызм стваралі атмасферу пераўтварэнняў, падтрымкі працэсаў, разгорнутых савецкай уладай. І зусім не ўспрымаецца пазіцыя В. Храптовіч-Буцянёвай, калі яна з пагардлівым здзіўленнем заўважае, што раптам на ўсіх пасадах аднекуль з'явіліся беларусы. Як быццам бы беларусам трэба было аднекуль з'яўляцца і «ўсходнія крэсы» не былі іх спрадвечнай радзімай... Падаецца, што цяперашняе пакаленне можа сумнявацца ў правільнасці пазіцыі і выбару нашых продкаў, але мы павінны ўсведамляць, што яны былі іншымі паводле светаўспрымання, умоў жыцця, мар, учынкаў. Уз'яднанне савецкай і Заходняй Беларусі з наступным уваходжаннем яе ў склад СССР засведчыла не толькі заканчэнне працэсу аб'яднання беларускага этнасу, але і відавочны рост нацыянальнай самасвядомасці, усведамленне сябе адзіным цэлым па мове, гісторыі, культуры, адзіным народам.

*1. Айзенштадт, Г.* Особое назначение / Г. Айзенштадт // Знамя юности. – 1989. – 30 окт. – С. 3.

*2.* Памяць: Гісторыка-дакументальная хроніка Пінскага раёна. – Мінск : БЕЛТА, 2003. – 624 с.

*3. Пашкевіч, А. В.* Парламенцкія формы змагання за нацыянальныя і сацыяльныя правы беларускага народа ў міжваеннай Польшчы (1921–1930) : аўтарэф. дыс. … канд. гіст. навук : 07.00.02 / А. В. Пашкевіч ; Ін-т гіст. НАН Беларусі. – Мінск, 2006. – 21 с.

*4. Рогачева, Л. М.* Культурное строительство в Беларуси: состояние и проблемы (На материалах общественно-политических организаций). 1938 – июнь 1941 г. : дис. … канд. ист. наук : 07.00.01 / Л. М. Рогачева. – Минск, 1992. – 158 с.

*5.* «Ты з Заходняй, я з Усходняй нашай Беларусі …». Верасень 1939–1956 гг. : дакументы і матэрыялы : у 2 кн. / склад.: У. І. Адамушка [і інш.]. – Мінск : Беларус. навука, 2009. – Кн. 1 : Верасень 1939–1941 гг. – 340 с.

*6.* Установа «Занальны дзяржаўны архіў у г. Пінску». – Ф. 211. – Воп. 1. – Спр. 6.

*7. Хрептович-Бутенева, О. А.* Перелом (1939–1942) / О. А. Хрептович-Бутенева. – Париж : YMCA-Press, 1984. – 230 с. – (Всероссийская мемуарная библиотека).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*M. Byaspalaya*

**Autumn of the 1939th: dramatic changes of socio-cultural life of Western Belarus**

*The article deals with the events that occurred on the territory of Western Belarus in September-November 1939. The distinctive features of socio-political situation, which was formed in the "eastern land" during 1921–1939 and became one of the conditions for the rapid establishment of Soviet power, are revealed. The methods of implementation of the economic and socio-cultural policy, as well as the attitude of local population to them are analyzed.*

Дата паступлення артыкула ў рэдакцыю: 05.09.2019.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ